# ***Экспазіцыя***
# ***«Быў храм дзяцінства незабыўны»***

Экспазіцыя прысвечана былой установе адукацыі «Мількаўшчынская базавая школа».

За 66-гадовую гісторыю існавання школу закончылі каля тысячы чалавек. Да 60-годдзя школы быў складзены яе летапіс, які з'явіўся вынікам сустрэч з былымі настаўнікамі і выпускнікамі, запісаў іх успамінаў, работы ў дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці. Дзякуючы вялікай даследчай працы, у школьным летапісе змешчаны прозвішчы ўсіх выпускнікоў школы, пачынаючы з 1952 года.

Экспазіцыя насычана фотаздымкамі былой школы, настаўнікаў, якія працавалі ў розныя гады, выпускнікоў. Прадстаўлены матэрыялы аб сістэме адукацыі розных гадоў: школьныя прыналежнасці, падручнікі, сшыткі, дзеннікі навучэнцаў, дакументы аб адукацыі (атэстаты, граматы, дыпломы), школьная форма для хлопцаў і дзяўчынак, прынятая ў 60-80-ыя гады прошлага стагоддзя, атрыбуты дзіцячых арганізацый (акцябрацкія зорачка, піянерскі гальштук, горн, барабан) і інш.



